## Партызанскія фарміраванні Чэрвеньскага раёна

Вольскі В. М.
Навуковы кіраўнік канд. гіст. навук, дацэнт Лойка Т. В.
Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт

Чэрвеньскі раён займае большую частку тэрыторыі лясных масіваў паміж рэкамі Свіслач і Волма. У гады вайны раён стаў цэнтрам партызанскай барацьбы ва ўсходняй частцы Міншчыны. Умовы для дзеяння партызан у гэтых мясцінах былі вельмі складаныя, таму што побач пралягала шмат дарог. Але партызаны мужна змагаліся з ворагам, нават у такіх умовах. Найбольш моцнымі і стойкімі партызанскімі фарміраваннямі былі:

**Партызанскі атрад «Разгром»** быў арганізаваны ў лютым 1942 г. у Чэрвеньскім і Смалявіцкім раёнах з групы партыйна-савецкіх работнікаў, якую ўзначаліў І.Л.Сацункевіч, і ваеннаслужачых, што не выйшлі з варожага тылу. Да кастрычніка 1942 г. атрад дзейнічаў самастойна. 3 кастрычніка 1942 г. уваходзіў у склад партызанскай брыгады «Разгром». На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі ў ім было 337 чалавек.

**Партызанскі атрад імя газеты «Праўда»** арганізаваны ў красавіку 1942 г. у Чэрвеньскім раёне. Напачатку дзейнічаў самастойна, з кастрычніка 1942 па кастрычнік 1943 – у складзе 1-й Мінскай брыгады, з кастрычніка 1943 г. – у складзе партызанскай брыгады імя газеты «Праўда». На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 429 партызан.

**Партызанскі атрад «Сцяг»** арганізаваны ў маі 1942 г. з жыхароў вёсак Чарнаградзь, Чарнава, Вялікі Бор і Новыя Зяленькі Чэрвеньскага раёна. Да кастрычніка 1942 г. дзейнічаў самастойна, затым увайшоў у брыгаду «Разгром» і ў яе складзе змагаўся з фашыстамі да ліпеня 1944 г. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 442 партызаны.

**Партызанскі атрад «Перамога»** арганізаваны 20 верасня 1942 г. з партызан, выдзеленых атрадам «Бальшавік», і жыхароў Чэрвеньскага раёна. 3 кастрычніка 1942 г. – у складзе брыгады імя Шчорса. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 306 партызан.

**Атрад «Баявы»** арганізаваны за лініяй фронту ў жніўні 1942 г. па ініцыятыве Флегантава, у Чэрвеньскі раён прыбыў у кастрычніку 1942 г. і склаў аснову партызанскай брыгады «За Радзіму». На дзень расфарміравання налічваў 220 партызан.

Атрад «Беларусь» арганізаваны ў жніўні 1941 г. сакратаром Рудзенскага РК КП(б)Б Мікалаем Пракопавічам Пакроўскім. Са жніўня па снежань 1941 г. і з красавіка па снежань 1942 г. атрад «Беларусь» паспяхова правёў 27 баявых аперацый на тэрыторыі Рудзенскага і Чэрвеньскага раёнаў, пусціў пад адхон тры варожыя эталоны, спаліў 11 мастоў і мясцовую фабрыку ў Смілавічах, якая працавала на вермахт.

**Атрад «Радзіма»** арганізаваны ў сакавіку 1943 г. з групы партызан атрада «Разгром». На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі атрад налічваў 213 партызан.

2 ліпеня 1944 г. быў вызвалены Чэрвень. У баях за вызваленне Чэрвеньшчыны вызначыліся Герой Савецкага Саюза капітан Павел Паўлавіч Хрусталёў, генерал-маёр Георгій Іванавіч Дружынін, палкоўнік Канстанцін Аляксеевіч Турчанінаў, падпалкоўнікі Мікалай Паўлавіч Палякоў, Пётр Пятровіч Разакоў і многія, многія іншыя. У аперацыі па разгроме гітлераўскіх войскаў былі забіты 92, узяты ў палон 1436 салдат і афіцэраў праціўніка. Агульная колькасць партызан перавышала 10 000 чалавек. Больш 8 000 жыхароў раёна ваявалі на фронце. З улікам мірнага насельніцтва Чэрвеньшчына страціла ў гэтай вайне больш 11 000 чалавек – кожнага 3-га…